# **Мікратапонімы Спондаўскага краю**

Родны мой куточак,
Бацькаўшчына міла…
Г.Станевіч

У маёй Бацькаўшчыне кожны куточак: лес, поле, луг, урочышча, гай, горы маюць сваю назву, , як і кожны чалавек сваё, Богам дадзенае імя.

Калі сабраць гэтыя назвы па ўсёй Беларусі, то атрымаўся б мнагатомны слоўнік. А між тым, людзей, якія могуць назваць тую ці іншую мясціну засталося зусім няшмат. Калі спытаць маладога, або нават сярэдніх год чалавека дзе знаходзіцца, напрыклад, ***Барсучына, Рачкава Лука*** або ***Папова гара***, яны не толькі не адкажуць, але нават і назваў гэтых не чулі. Памятаюць і ведаюць гэта толькі сівенькія бабулі і дзядулі, і нам трэба не спазніцца сабраць гэтыя звесткі.

Даваць назвы геаграфічным аб'ектам чалавек пачаў спакон веку. Дастаткова ўспомніць Евангелле: гара, дзе маліўся Збавіцель па апошняй вячэры, называлася Аліўнай, распялі Хрыста на Галгофе, што значыць "месца чэрапу", зямлю, якую цаной крыўды, за 30 сярэбраннікаў купіў Юда Іскарыёт, ды і загінуў на ёй, назвалі "Акельдама – гэта ёсць зямля крыві".

Калі прааналізаваць мікратапонімы нашай мясцовасці, то заўважаеш, што пераважная большасць назваў характэрызуюць рэльеф або расліннасць той мясцовасці: ***Церабеж, Вербнікі, Дубнікі, Дуброва, Елаўцы, Грэбла, Грымячы ручэй, Гуры, Паплавы, Пескаватка, Падровя, Ямішчы, Жаўцякі, Жвіркі, Стоцяя гара, Белы пясок, Арэшнікі, Жвіраватка, Жвіроўня, Глінішча*** і інш.

Прыкладна трэцюю частку складаюць назвы, якія паходзяць ад імён іх уладальнікаў, або людзей, якія мелі нейкае дачыненне да гэтай мясцовасці: ***Барадыначкаў дзірван, Бахцюкова ніўка, Баравая аселіца, Дворнае поле, Дзехцярышкі, Польцімя, Колева гара, Янкава гара, Юхнішкі, Яцынава поле, Петрашышскія сенажаці, Стральцова гара, Януткаў дзірван, Бушэўскі лес, Юхнаў дзірван, Станевічава***

***ніўка, Харашэева поле, Яцынава поле, Лейбава гара, Яцкава гара, Рамашова гара, Марысьчына поле*** і інш.

Многія назвы адлюстроўваюць падзеі, якія там некалі адбываліся: ***Памены, Цыганскі табар, Церабеж, Высмалы, Пагарэлле, Выгары, Прызба, Судзілка, Зруб, Дрывасек, Выгары, Гарэлішкі, Вісюра*** (вельмі высокая гара). У размоўнай лексіцы нашай мясцовасці захавалася і па сённяшні дзень слова “вісус”, што значыць: верхалаз, смелы, адчайны. Адгэтуль і назва гары – кажуць, што толькі “вісусы” і маглі адважыцца катацца з гэтай гары.

Многія назвы настолькі дакладна вызначаюць прыкметы мясцовасці, што нават не ведаючы, дзе яны знаходзяцца, можна лёгка здагадацца ўбачыўшы іх. Напрыклад, ***Паплавы, Жвірыдаўка, Каменны масток, Стаў, Шпіклерная гара, Курыліха, Цёмныя.*** Так, калі падыходзіш да ляснога балота з бліскучымі люстэрачкамі вады, над якой як бы курыцца дым, то адразу ж здагадваешся, што гэта і ёсць таямнічая ***Курыліха***.



**Курыліха** (фота І.Валуевіч)

Яшчэ ***Цёмныя***. З расказу Я.Б.Канчанін: “З маленства чула гэту назву, а дзе яны знаходзяцца не ведала. Аднаго разу, пасвячы з бацькам кароў, прыгналі іх да ўскрайку лесу, які мне паказаўся надта змрочным і няўтульным. Вось тады я і здагадалася, што гэта - Цёмныя.

***Судзілка*** – відавочна, што за гэты лес быў нейкі судовы спор.

## <u>Мікратапонімы Спондаўскага краю</u>

***Палачніва***. Напаткаць чалавека, які б мог растлумачыць паходжанне гэтай назвы не ўдалося, але сама назва наводзіць на думку, што некалі там, магчыма, адбываліся нейкія крывавыя падзеі і складалася назва з двух слоў: палач – ніва.

Існуе многа назваў, паходжанне і значэнне якіх ужо схавана за завесай часу: ***<u>Крыськамшар, Прэсі, Пякета, Камайчык, Даржэнькі, Жарства, Жарык, Кінеўя, Крурмец, Падыльма, Сцімбрышкі, Крокенікі, Ціжышкі, Шкапленіца, Шорцава</u>*** і г.д.

Некаторыя назвы паўтараюцца. У кожнай вёсцы да прыкладу свая Аселіца, Бярэзнік, Асіннік, Сасоннік, ёсць дзве Каменныя гары, два Каменныя масткі, некалькі Лучак, два Чортавы балоты, два Чортавы масты. Сама назва Чортавага моста перасцерагае, што там патрэбна быць пільным. На адным з іх, што каля Яцкун, казалі спрадвеку “нячысты” пераймаў людзей: то белым баранчыкам прыкінецца і завядзе ў лясную глухамань, а то і гаспадарскія павозкі часта з моста скідваў. А на другім, які знаходзіцца ў лесе па дарозе, што вядзе на Барані - разбіліся тры аўтамабілі, хоць, здаецца, і прычыны для гэтага не было: Чортаў мост знаходзіцца на даволі прамым участку лясной дарогі.



**Чортаў мост** (фота І.Валуевіч)

Мікратапонімы Спондаўскага краю

Яшчэ можна заўважыць, што адны назвы як бы светлыя, вясёлыя: ***Радушыха, Ёлачкі, Зялёненькая, Нівейкі, Хмялiннік, Зязюльчын гаёк, Асінавы масток, Чубок, Садок,*** другія, наадварот, змрочныя, панурыя: ***Ёдаўка*** (чорны лес – літ.) ***Верацея, Воўчыя ямы, Мяцюклы, Цёмныя, Дзікавіны, Мачула, Дзігімы, Скяршыны.*** Апошнюю назву мне часта даводзілася чуць у дзяцінстве (бацькаў быў паляўнічым). Ад гэтай назвы у мяне сэрца сціскалася ад страху, уяўляўся чорны, змрочны яловы лес, недзе ў вяршалінах якога жыў страшны казачны птах з магутнымі бязгучнымі крыламі. І нездарма. Пазней выявілася, што ***Скяршына*** – гэта скрыжаванне лясных дарог. Адна з дарог – гэта гасцінец, які злучаў два буйныя кірмашы: Лынтупы і Міхалішкі. Другая – на хутары, на Пагулянку. На скрыжаванні стаяла карчма. Гаварылі, што туды хочаш не хочаш, а пападалі амаль усе, хто праязджаў міма. На тым месцы страшна сыпучыя пяскі, коні чуць дацягвалі да карчмы і спыняліся. А ўвогуле мужыкі любілі туды заходзіць, сервіс там быў поўны: і паесці, і выпіць, і пераначаваць можна было падарожніку. Для коней таксама стайня і корм былі прыгатаваны. Куды знікла тая карчма, зараз ужо ніхто не памятае, можа тыя сыпучыя пяскі занеслі, але потым на расстанні дарог сталі хаваць вісельнікаў і іншых самагубцаў з усёй акругі (некалькі парафій), каб людзі развозілі іх грахі на ўсе стораны свету.

Захавалася шмат гістарычных фактаў і тапанімічных паданняў. Напрыклад, ***Зязюльчын лясок*** (яшчэ называюць “Зязюлька”, “Зязюльчын гаёк”) названы так таму, што некалі тут Напалеону, які прыпыніўся адпачыць у гэтым гаёчку, зязюля накукавала кароткі век.

Вядома, што у ***Пятрашысных сенажацях*** на Юхнавым дзірване пахаваны у час Вялікай Айчыннай вайны беглы немец. Ён хаваўся ў нашым лесе і жанчыны баяліся хадзіць па грыбы і ягады. Потым ён згвалтаваў дзяўчынку з хутара Цямнуха. Насельніцтва паскардзілася партызанам, якія і пакаралі яго.

На ***Козім хрыбце***, таксама расказвалі людзі, пахаваны рускі салдат Косця, забіты у 1942 годзе немцамі, якога выдалі, дарэчы, мясцовыя сталоўскія людзі.

Цікавае паданне пра ***Глей***. Глей – гэта назва лесу і хутара, які тут некалі быў. Там былі вялікія запасы глін працавала цагельня, якую трымаў Кісель Іван Аляксандравіч.

Кажуць, добрую цэглу выраблялі, хоць і уручную. А яшчэ на пачатку мінулага веку там стаяла карчма.

***Глей*** – невялікі і вельмі грыбны лес, але многія кажуць, што там уздзейнічаюць на грыбнікоў нейкія цёмныя сілы: лёгка можна заблудзіцца нават днём. З аповяду **Гені Міхновіч**: “Збірала ў Гляі грыбы і натрапіла на такое баравічнае месца-рэзала і рэзала. Можа штук 100, а то і больш. Як усе сабрала, падняла галаву і не магу ўцяміць, дзе знаходжуся! Тут жа і страх і паніка апанталі. Потым усё - ткі ўзяла сябе ў рукі і падумала: “Чаго ж маю баяцца – лес малы, куды-небудзь ды выйду. І сапраўды, страх адступіў, хутка выйшла на сцежку, што вяла дадому”.

А многія і падоўгу кружылі ў лесе, не знаходзячы выхаду. З аповеду **Казі Валуевіч**: “Аднойчы была ў сваім двары і бачу ідзе проста у наш двор мужчына з суседняй вёскі з поўным кошыкам грыбоў. Пытаюся: “А чаго ты сюды ідзеш? Табе ж у зваротную старану трэба.” А ён кажа: “Збіраў грыбы ў Гляі, а выйсці ніяк не магу.” Казя вывела яго на дарогу, паказала куды трэба ісці, а ён падышоў трошкі, развярнуўся і зноў у супрацьлеглы бок ідзе! Тады яна правяла гэтага чалавека далей і наверчыла: “ Пеpажагнайся, замружыся, акруціся, ідзі і вочы табе адчыняцца!” Калі ён так зрабіў, тады толькі ўбачыў трубу і цагельню ў Пятрашышках і смела пайшоў дахаты.

Ніхто не памятае, каб у Гляі адбываліся якія трагічныя падзеі, толькі яшчэ не забыта гісторыя пра хлопца з засценка Устронье, які перад самой вайной гуляў у вёсцы Сухарышкі вяселле. Знайшлі яго вісячым у Глія пры дарозе на елцы, прычым са свайго надзелу. Прычына, што падштурхнула хлопца на гэты ўчынак была як бы і не зусім сур’ёзная. У першы дзень вяселля прыйшла моладзь вечарам на танцы і ён хацеў сваёй дружцы даць цукерак: палез у кішэню плашча, а цукерак не аказалася. Не вынес гэтага сораму і такім чынам закончыў жыццё самагубствам. На самой справе ён пераблытаў плашчы – палез у чужую пустую кішэню (плашчы былі аднолькавыя).

Побач знаходзілася балота ***Падубішча,*** праз якое дарога вяла на хутары. Адзін стары пастух, які любіў праседжваць у карчме зробленыя грошы, пасля чарговых пасядзелак позна ы, ўночы варочаўся дахаты. Была ранняя восень, лёгкі туман сцяліўся па балоце і вось наперад яму стаў забягаць хлопчык, ды

яшчэ і дражніць пачаў. “Ах ты, гунвоз! Я ж табе пакажу!” – пагнаўся за хлапчуком, прагнаў яго і, задаволены, палез на печ: ногі злажыў на комін, узяў пастухоўскую дудачку і пачаў іграць. Прачынаецца раніцай – ляжыць ён у Падубішчы на кургане, ногі на куст закінуты, а ў зубах корч. Кажуць пасля гэтага, калі і заходзіў зрэдку у карчму, то толькі днём і ненадоўга.

Побач з Глеем размяшчаўся луг ***Лучкі***, паўз якія працякаў роў. Расказвалі, што Лучкі мелі ўласцівасць прадказваць надыход вясны. Сяляне з навакольных вёсак прыходзілі слухаць: калі Лучкі гудуць, значыць пара рыхтаваць начынне – вясна на падыходзе, а калі цішыня – спі, мужык, спакойна!

У 80-х гадах, калі пабудавалі гравійную дарогу, у выніку няправільных інжынерных рашэнняў, засыпала пяском трубу і на месцы Лучак утварылася возера. У вадзе апынуліся будынкі некаторых гаспадароў, у прыватнасці, тры вянкі лазні Шапеля Бярнарда. Яны пачалі скардзіцца, улады іх скаргі адрасавалі Ашмянскаму ДРБУ. Летам 1984 года прыслалі бульдозер, каб абмяліць возера. Але, як толькі бульдозер пачаў раскопваць дарогу, напор вады аказаўся такім моцным, што ў момант прарваў дарожны насып і бульдозер ледзьве паспеў выехаць на цвёрды грунт. Лавіна вады рынулася ўперад, шукаючы сабе дарогу да мора. Жыхары вёскі Будрані, якая знаходзіцца ў 1,5 кіламетра ад гэтага возера, расказвалі, што адразу не маглі ўцяміць, што такое дзеецца: сонца свеціць, і неба яснае, і самалёта не бачна, а нейкі незвычайны рокат і гул усё нарастае і набліжаецца. Коўшык Эмілія, якая ў гэты час палола градкі, пачуўшы гэты рокат пачала жагнацца – думала пачаўся канец свету. Праз імгненне ўбачылі, што на іх вёску са страшэннай хуткасцю нясецца вадзяны вал, вышынёй у два метры. Хаваліся, хто куды змог, на дрэва, на страху дома. Толькі тыя, хто сядзеў у хаце ні аб чым не здагадваліся. Гэты вадзяны паток нёсся, выбіраючы больш нізкія мясціны і, на шчасце, амаль што, абмінуў вёску. Толькі аднаму гаспадару вада папала ў хлеў і стаяла пару дзён вышынёй у паўметра. Каля драўлянага мастка ў вёсцы ляжалі камяні, прыкладна па паўтоны і больш вагой, паток вады адкаціў іх на 20 метраў.

## Мікратапонімы Спондаўскага краю

***Красны луг.*** Наконт гэтай назвы існуюць два меркаванні:

1) раней там была багна, нават каровы тапіліся, стаяла чырвоная жыжа. У 60-х гадах нарыхтоўвалі торф для калгаса, выкопвалі бярвенні і мох;

2) расказвалі, што спрадвеку там зданні падаваліся: хто бачыў людзей, хто чырвоныя вогнішчы, часта нехта чырвоныя посцілкі коням на вочы накідваў, каб падарожных збіць са шляху. Прыкметна, што і бальшавікі, калі яшчэ збіраліся нелегальна ( 1939г.), для сваіх сходак аблюбавалі Красны луг. Можа ім назва гэта імпанавала. А магчыма і па другой прычыне…

Аднойчы мой дзед (Субач Ян), каб хутчэй дабрацца дадому, пайшоў праз Красны луг, выраашыўшы спрасціць дарогу, набрыў на сходку камуністычнай ячэйкі. Яны сядзелі каля кастра і нешта абмяркоўвалі. Дзеда не чапалі, але строга яму наказалі: "Калі што ад цябе выйдзе, то не табе, ні тваёй сям'і не жыць".

***Папова Гара*** ***З аповеду*** **Казі Валуевіч** ***з Пілімаў.*** знаходзіцца непадалёк ад касцёла у в. Ж-Жалядскія. Звязаная з гэтай назвай бытуе ў нашай мясцовасці вясёлая гісторыя.

У мінулым веку нейкі час працаваў у Жэлядскім касцёле ксёндз Бародзіч, вялікі арыгінал, якога вельмі любілі парафіяне і гісторыі пра яго перадавалі з пакалення ў пакаленне. Ён амаль не браў у людзей плату за розныя касцельныя паслугі, хадзіў часцяком босы, каб быць падобным на Збавіцеля. А яшчэ вельмі любіў весела пажартаваць. Аднойчы па нейкай справе прыехалі да яго два папы на новай прыгожай брычцы. Пасядзелі, абмеркавалі ўсе справы, а калі папы сабраліся ехаць дадому, Бародзіч, папярэдне падгаварыўшы арганіста, прапанаваў: "Давайце памераемся сілай! Калі вы ўдваіх звязеце мяне з гары у брычцы, то я ўсцягну пустую брычку на гару адзін". Папы, не адчуўшы ніякага падвоху, падзівіліся такой неразумнай, нават смешнай прапанове і… згадзіліся. А як толькі ксёндз усеўся ў брычку і папы пацягнулі яго, упрогшыся ў аглоблі, тут, як з-пад зямлі вырас арганіст і сфатаграфаваў усю кампанію. Пакрыўдзіліся папы на такія жарты і больш не прыязджалі да Бародзіча (чаго ён і дабіваўся). А гара у сувязі з гэтым выпадкам і па сённяшні дзень называецца Паповай.

***Бравaрышча.*** Балота каля Клюшчан.

<u>Мікратапонімы Спондаўскага краю</u>

Кісялёўскага чалавека па празвішчы Козел сябры запрасілі ў клюшчанскую карчму, дзе ён і заседзеўся дапазна. Апоўначы сабраўся дадому. Выехаў за Клюшчані, як раптам пачуліся яму чароўныя гукі скрыпкі. Стаў прыслухоўвацца – музыка даносілася з балота, што пры дарозе. І так віртуозна граў скрыпач, так заварожвала гэта мелодыя, што чалавек скіраваў каня, каб пад'ехаць бліжай. А матыў станавіўся ўсё весялейшы, маніла і звала за сабою скрыпка ўсё далей у гушчар і нарэшце, конь спыніўся як укапаны і селянін убачыў перад сабой паляну, а там – вяселле. Народу шмат, П'юць, танцуюць, спяваюць. Козел таксама хацеў далучыцца да гэтай вясёлай кампаніі, павярнуў каня, каб прывязаць да дрэўца, як конь раптам праваліўся і пачаў тапіцца. І вяселле тут жа знікла – ні скрыпкі, ні танцуючых, як і не было нічога. Чалавек пабег назад у Клюшчані. Як трохі рассвіло, пайшоў з мужчынамі шукаць каня. З цяжкасцю знайшлі тое месца. Каня ўжо на паверхні не было бачна, толькі воз стаяў да паловы ўрыўшыся ў балота.

***<u>Варацечкі.</u>*** (З аповяду **Казі Валуевіч**). Пасля адмены прыгоннага права, пілімскія мужчыны так цешыліся, што атрымалі сваю зямлю і рашылі адгарадзіцца ад суседняй вёскі Кісялі плотам, а на дарозе, што вяла з Ж-Жалядскіх у Клюшчаны праз Пілямы, яны паставілі вароты. Калі з цягам часу ад плоту і следу не засталося, месца гэта так і прадаўжае называцца Варацечкі. Кажуць, што месца гэта нядобрае, шмат людзей загінула на гэтай мяжы – засыналі навечна. Нават і зараз, праходзячы праз Варацечкі, вечаровай або начной парой многім здавалася, што дзве хвалі паветра – халоднае і гарачае – ўдаралі падарожніку ў твар. Многіх падвыпіўшых мужчын нядобрая сіла вадзіла па балотах.

Вось што расказаў Рамуальд Валуевіч з вёскі Кісялі. Аднаго разу ён загасціўся ў Пілімах, заходзіў да некалькіх гаспадароў і заседзеўся дапазна. Прапаноўвалі застацца начаваць – ды хата блізка, сорамна. Калі праходзіў праз Варацечкі, адчуў як збілі шапку з галавы і як бы што на вочы накінулі. Яму падалося, што ён у Пабраддзі, нейкія муры вакол, і выйсця ніяк не можа знайсці. Часамі разумеў, што ён блукае недзе блізка ад дома, тады пачынаў маліцца. Прачытаў усе, якія ведаў малітвы: да Святой Марыі, Святога Антонія, жонку памерлую прасіў дапамагчы. Так да самай раніцы хадзіў па балотах, а прачнуўся

– ляжыць ён на кучы ламачча, недалёка ад дома. Адразу ж падумаў:"А можа ўсё гэта прыснілася?" Але шапкі так і не знайшоў!

***Чортава балота.*** Знаходзіцца паблізу Страчанкі. Цікавую гісторыю пра яго паходжанне паведаў мясцовы жыхар **Яновіч Зыгмунд**.

Гэта гісторыя здарылася ўжо мо са два вякі назад з адным вяскоўцам, які любіў хадзіць ў Свіра ў карчму. Аднойчы заседзеўся дапазна, а калі варочаўся на добрым "падпітку" дахаты, то ў Чортавым балоце заблудзіўся. Ніяк не мог выйсці – кружыў і кружыў па імшарыне. Ужо і змучыўся, хацеў прылегчы на курган спачнуць, як раптам з'явілася вялікае мноства чарцей, акружылі яго, далі ў рукі скрыпку і загадалі граць. Трэба зазначыць, што селянін той ніколі не быў музыкантам, але як толькі ўзяў у рукі тую "крывую скрыпачку", то так здорава стаў на ёй "наярываць", што самому захацелася пусціцца ў скокі. А ўжо чэрці весяліліся: кружыліся, падскоквалі, аж у вачах мільгацела. І пра музыканта не забывалі, падбягалі і шчодра сыпалі яму ў шапку грошы. Так яны выгульвалі, пакуль не стала світаць, а тады раптам ўсё знікла, як і не бывала. Чалавек пачаў думаць ці не страшны сон яму прысніўся. Ад успамінаў аж мурашкі па спіне пабеглі. "Не дай Бог яшчэ калі такі сон убачыць! Цьфу, цьфу, цьфу!" – сплюнуў праз левае плячо на зямлю і ледзь не абамлеў: ля ног ляжыць яго шапка, напоўненая… скамячанымі паперкамі.

***Чортава балота***. Знаходзіцца ў Каймінскім ельніку. Расказвалі тыя, каму даводзілася пасля змяркання праз гэта балота, у прыватнасці і мой бацька, то ніяк не маглі знайсці выйсця – крыжылі і кружылі па імшарыне да самых пеўняў. Дарэчы сказаць, з гэтых паданняў вынікае, што "нячысцікам" вельмі падабаецца гуляць у кошкі-мышкі з нецвярозымі кліентымі.

***Падазерца.*** Балота ў лесе насупраць Трашчан. Калісьці, калі лес яшчэ не падступаў так блізка да вёскі, на тым месцы было глухое азярцо з багністым дном. Расказвалі, што ад селяніна, які араў побач, вырваліся валы і пабеглі з гары да возера піць. Так і ўтапіліся разам з вупражжу і сахой. Зараз там растуць журавіны. Магчыма гэта адзінае месца ў нашым краі, дзе расце побач з журавінамі, малавядомы і рэдкі від раслін у

флоры Беларусі – багноўка (вадзяніка). У Беларусі сустракацца большай часткай ва ўсходняй яе частцы, сканцэнтрыравана ў зонах Паазер'я. Ягады багноўкі можна ўжываць у ежу, багата дубільнымі рэчывамі, выкарыстоўваецца таксама ў народнай медыцыне.

***Стаў.*** Невялікае поле перад лесам насупраць Трашчан. Адно з нямногіх месц, дзе расце каштоўная лекавая расліна – арніка горная. У гаючых уласцівасцях арнікі нашы людзі пераканаліся на прыкладзе салдата з вёскі Будрані, які не так даўно праходзіў службу на Далёкім Усходзе. На другім годзе службы падхапіў цяжкае захворванне скуры – ногі пакрыліся струпамі, не мог насіць абутак. Лячыўся ў вайсковым шпіталі, але хвароба распаўсюджвалася далей. Так, недалечанага, яго і камісавалі. Калі ішоў з цягніка дадому, то, расказвалі, што чаравікі былі поўныя крыві. Бацькі адразу ж сталі лячыць арнікай, добра што справа была летам і трава гэта расла блізка. За дзесяць дзён купання ў лазні ў адвары арнікі не толькі вылечылі хваробы, але нават усе рубцы на целе зацягнуліся і зніклі.

***Караснік.*** Заросшае возера, дрыгва, на участку дарогі ад Падкасцёлку да Пашкун. Будавалі гасцінец Полацк – Вільнюс (Полацкі тракт). Дарогі мела стратэгічнае значэнне. Будавалі польскія ўлады, а фінансаванне было з Германіі (1934-1935гг.). Вядома, што ўжо ў 1935 годзе на Вільнюс быў адкрыты аўтобусны маршрут (Грузтаксі вазіла людзей на Вільню).

Працавалі на будоўлі вольнанаёмныя сяляне з-пад Кобрына, якія цягалі вазы вагой паўтары - дзве тоны па перакапанай дарозе. Нашы сяляне таксама ўдзельнічалі ў будаўніцтве, як яны называлі, адбывалі шараварку. Кожны дарослы мужчына павінен быў два дні адпрацаваць на будоўлі.

Самы складаны ўчастак будаўніцтва быў Караснік. Пракладваць дарогу ў абход было далёка і пачалі сыпаць напроста. Пясок і гравій, які насыпалі на гэтым месцы знікаў бясследна: ад таго што навозілі за дзень – раніцой і знаку не заставалася. Тады вырашылі насыпаць цэмент у мяшкі і закладваць дарогу. Адразу закладалі па баках, зрабілі як бы калідор, а пасля, паступова засыпалі асноўнае палатно.

# Мікратапонімы Спондаўскага краю

**Здымак зроблены адразу ж пасля таго, як закончылі пракладваць дарогу праз Караснік.** (з сямейнага архіву І.Валуевіч)




***Святы камень***. Старажытны камень каля в. Вялікая Вёска. Маці Боская ў свой блаславёны месяц май сышла на зямлю, каб паслухаць, як славіць яе верны люд. І так ішла яна па зямлі, а людзі і птушкі славілі яе сваімі спевамі, лясы, палі і гаі адзяваліся ў самыя прыгожыя свае ўборы, каб сустрэць яе, духмяная чаромха і бэз уплятaлі кветкі ў яе косы. Праходзячы міма Вялікай Вёскі Багародзіца залюбавалася прыгажосцю тамтэйшых месц і стала на камень, каб лепш было бачна. А з вёскі маёвы вечар даносіў такі прыгожы спеў, як бы гэта і не людзі, а самі анёлы спявалі, славячы Бога. Узрадаваная Маці Божая заслухалася, затрымалася на некалькі хвілін і адбітак яе святой нагі застаўся на тым каменні.

Пэўна, гэта дар Маці Боскай, што галасістыя спявачкі ў вёсцы не пераводзяцца і сёння. Самыя прыгожыя галасы ў хоры Клюшчанскага касцёла – гэта галасы Пілімон Караліны, Тарэсы Сусвіла, Веры і Юзэфы Алешкевічаў – жанчын з Вялікай Вёскі.

## Мікратапонімы Спондаўскага краю

У выніку дзейнасці чалавека прыродны ландшафт часта мяняецца. Дзе была гара зараз можа быць кар'ер, непраходную багну змянілі меліярацыйныя каналы. Але новых назваў не паяўляецца, магчыма і таму, што няма ўжо сапраўдных гаспадароў на зямлі. Як піша паэт Мар'ян Дукса: "зямліцу ўжо даўно ніхто не гладзіць ласкава далонню".

А яшчэ захаваліся назвы вёсак і хутароў, якія ўжо бязлітасна знесены з твару зямлі і напамінаюць аб іх колішнім існаванні толькі выбухі квітнеючага бэзу і язміну вясной, ды падмуркавыя камні.

Але аб гэтым асобная размова.

Мэта гэтага выдання максімальна сабраць і захаваць для будучых пакаленняў тыя назвы з іх своеасаблівым самабытным, уласцівым толькі дадзенай мясцовасці каларытам, якія нашы дзяды і прадзеды з пяшчотай кожнаму куточку роднай зямлі. Гэта выданне будзе цікавым і карысным, можа паслужыць своеасаблівым дапаможнікам для паляўнічых, леснікоў, памежнікаў і грыбнікоў. Я лічу, што не менш каштоўным будзе дадзенае выданне і для ўсіх тых, хто з наведвае наш край з мэтай больш блізкага знаёмства, г.зн. турыстам.

Выданне будзе цікавым усім, хто ганарыцца, што нарадзіўся на гэтай зямлі, каму дарага памяць бацькоў, хто не хоча "жыць дзіцём без роду" (П.Панчанка), хто закаханы ў гэты цудоўны азёрны край.

Далей прадстаўлены слоўнік мікратапонімаў, які падзелены на тры часткі:

1. **Гідратапонімы (рэчкі, ручаі,балоты, масткі).**
2. **Назвы палёў, гор, ніваў.**
3. **Назвы лясоў і пералескаў.**

Скампанаваны назвы па прынцыпу набліжанасці да таго ці іншага населенага пункта. Пададзены гістарычныя звесткі і легенды, звязаныя з канкрэтнымі назвамі, а таксама некаторыя асаблівасці флоры і фауны. Назвы пададзены так, як іх з пяшчотай давалі кожнаму куточку, як вымаўляюць у дадзенай мясцовасці. Напрыклад: лес Бушэўскага, а ў гістарычных крыніцах гэта прозвішча запісана як Бішэўскі і Бышэўскі, і г.д.

## Мікратапонімы Спондаўскага краю

### Гідратапонімы

1. **Грэбла** – непраходня багна каля Глушыцы пад лесам па дарозе, што вядзе на рэчку Трасцяніцы, азёры і в. Саракі. Клалі насціл з бярвенняў, яловых лапак, каменні. У 70-х гадах мінулага стагоддзя пад час меліярацыі асушана.
2. **Руда** – балота з запасамі торфа (па словах жыхароў маюцца запасы нафты).
3. **Купіна** – балота.
4. **Каменны масток.**
5. **Церабеж.**
6. **Камайчык –** балота каля Сухарышак.
7. **Кабыляе балота** – (расказвалі, што адзін удавец па загаду новай жонкі забіў свайго сына ад першай жонкі і закапаў у гэтым балоце).
8. **Курыліха** – балота ў лесе.
9. **Мяцюклы** – глухое балота ў лесе.
10. **Стаў** – лясная рэчка і поле.
11. **Пральня** – брод цераз стаў.
12. **Крурмец** – балота.
13. **Вялікі лог** – купіна каля Спондаў.
14. **Казлоў мост –** па дарозе Сponды – Кайміна. У 1982 г. трагічна загінуў Гена Барадынка (разбіўся на матацыкле).
15. **Забалаці.**
16. **Паплавы.**
17. **Махі –** балота ў лесе, залежы торфу, гняздзяцца жуpавы.
18. **Забалаць –** балота каля Ж-Жалядскіх.
19. **Чортаў ручэй (Клевядаў ручэй) –** упадае ў рэчку Струна.
20. **Грэбла –** багна, пераходзілі па каменнях.
21. **Глыбокі ручэй.**
22. **Струна –** рэчка, цячэ з Літвы, упадае ў рэчку Страча.
23. **Доўгае балота -** каля хутара Барок.
24. **Каменны мост.**
25. **Паміжлозя –** каля Стаўпянят.
26. **Асінавае балота.**
27. **Чортава балота –** каля Страчанкі.
28. **Страча –** рэчка.
29. **Ціжышкі**
30. **Каралёўка**

Мікратапонімы Спондаўскага краю

**31. Мачула.**
**32. Сутокі** – паміж возерам Губеза і Ёдзеўскім
**33. Амшарык.**
**34. Крылішкі** – балота за Вераб'ямі
**35. Востраў –** балота каля Страчы.
**36. Караснік –** заросшае возера, дрыгва.
**37. Мельніца –** вадапад на рэчцы Страча, любімае месца рыбаловаў.
**38. Журавіннік –** балаціна
**39.Абрыў –** пляж на рэчцы Страча. Знаходзіцца помнік рэспубліканскага значэння, геалагічны разрэз Камарышкі
**40. Касмылішкі** – балота паміж Гінкішкамі і Горшавічамі
**41.Даляцішкі –** балота каля Горшавіч. Праз яго было пралажана дарожка напроста, якой карысталіся жыхары в. Горшавічы да ўрагану 1999г. Заваліла бураломам.
**42. Пасячына -** страшная дрыгва. Неаднойчы гаспадары выцягвалі адтуль на вяроўках сваіх кароў, якія забрылі туды схавацца ад спёкі. Утапіўся конь.
**43. Глыбокі алешнік –** балота, якое знаходзіцца ніжэй узроўню возера.
**44. Чортава балота –** у ельніку, каля Кайміны.
**45. Рэвіна.**
**46. Длугі мост –** у Ёдаўцы, каля былога хутара Ёдабор. Вядома, што па гэтаму масту адступаў Напалеон. Захаваліся 4 капцы. Потым замест маста лажылі ляжнёўку з цэлых ствалоў дрэва.
**47. Сутокі -** пераход праз возера на Падліпе.
**48. Вялікае балота –** каля Акартэляў
**49. Грымячы ручэй –** паміж Ствaламі і Акартэлямі, упадае ў Белае возера.
**50. Вялікія –** лужок каля рэчкі Трасцяніцы.
**51. Супорныя –** балота, хмызнякі.
**52. Трысцяніца –** рэчка.
**53. Цёмнае балота –** пад Гудалямі..
**54. Гразкое балота –** пад Пілімамі.
**55. Дворнае балота –** належала Лынтупскаму пану Юзэфу Бішэўскаму.
**56. Чортаў мост** – за Яцкунамі, па Вялікай дарозе.

**57. Мачула** – балота ў Кісялях.
**58. Лучкі.**
**59. Зыбняжок.**
**60. Доўгае балота.**
**61. Гарэлае балота –** растуць журавіны.
**62. Ядвініна балота.**
**63. Іждык –** луг пад Клюшчанямі.
**64. Глыбокі роў (Глыбокі ручэй) –** каля Шайкунь, упадае ў Баранскую рэчку.
**65. Грэбля –** балота ў Іждыку
**66. Бравstreet -** балота.
**67. Сухое балота.**
**68. Дуброўка.**
**69. Краснае** – каля Вялікай Вёскі.
**70. Ніцая лаза.**
**71. Даўгялішкі –** на мяжы з Літвой.
**72. Кнігаўка.**
**73. Мошка.**
**74. Кладкі.**
**75. Маскоўка.**
**76. Ручэй.**
**77. Асінавы масток.**
**78. Марэйня.**
**79. Мухаватае балота –** ля Сухарышак. Была выкапана зямлянка, дзе вайной хаваліся ад немцаў людзі.
**80. Малое балацечка.**
**81. Падубішча.**
**82. Азярцо –** ля вёскі Лакцяні, глухое азярцо ў лесе, зараз амаль зараслае, растуць журавіны.
**83. Чортава яма –** акно ў азярцы, прападалі людзі.
**84. Высыпана грэбла –** каля Будрань, па дарозе, што вядзе на Барані.
**85. Чортаў мост.**
**86. Зайчае балота –** водзяцца карасі.
**87. Гнілое балота.**

## Мікратапонімы Спондаўскага краю

### Назвы палёў, гор і ніваў

1. **Вялікая ніва** - поле каля Глушыцы.
2. **Жураўліннік** - паходжанне назвы невядома ці то ад журавоў, якія там некалі гняздзіліся, ці то ад журавін.
3. **Жодзішкі** - сенакос.
4. **Граніца** - невялікі дзірванок паўз які праходзіла мяжа паміж Масцянскім і Страчскім калгасамі.
5. **Прыдаткі** - поле.
6. **Гародчык.**
7. **Дзірван.**
8. **Жвіркі.**
9. **Коляў сад.**
10. **Папярэчка.**
11. **Курганы** - да меліарацыі была няўдобіца.
12. **Станевічава ніўка.**
13. **Барадыначкаў дзірван.**
14. **Бахцюкова гара.**
15. **Хлебніца** – поле за Бахцюковай гарой, каля трэцяй Глушыцы. Названа так мясцовымі жартаўнікамі за тое, што вельмі неўрадлівае, акрамя лубіну нічога не расце.
16. **Церабеж** - няўдобіца.
17. **Каменная гара.**
18. **Вобліца.**
19. **Троішча** - сенакос каля Трашчан.
20. **Шляі** - сенакос.
21. **Бацяно.**
22. **Троішча** - поле, раней там працякалі тры ручаі, якія потым зліваліся ў адзін.
23. **Жвіраватка** - поле.
24. **Лукоць** - ворнае поле.
25. **Замкі** - поле каля лесу
26. **Паддубнікі** - гара.
27. **Рудзішкі** - поле.
28. **Арэшнікі.**
29. **Дубнікі** - высока гара.
30. **Падыльма** - сенажаць.
31. **Мушарнік** - сенажаць, дзе здабывалі торф.
32. **Язвінцы** – сенажаць.

**33. Петрашысныя сенажаці** – вялікая плошча ў лесе. За польскім часам належала Пятрашысным гаспадарам.

**34. Ямішчы.**

**35. Юхнаў дзірван.**

**36. Кіневатка** - людскія соткі і сенажаць каля Спондаў.

**37. Памены** - гара і ворнае поле.

**38. Жвірыдаўка.**

**39. Польцімя.**

**40.Хмяліннік** - хмызнякі, сенакос. Пад час вайны Спондаўскія жыхары хаваліся ад немцаў.

**41.Дуброва** - доўгая сенажаць, да меліярацыі была багна. Такавішчы цецерукоў.

**42.Амшарына.**

**43.Раманішкі** - поле ад Спондаў да Кайміны.

**44.Нівейкі** - поле і луг.

**45.Ёлачкі** – поле.

**46.Рэпішча** - поле каля Асташышак.

**47.Мількішкі.**

**48.Глінішча**- поле пад Асташышкамі.

49.**Дворнае поле** - паміж Спондамі і Ж- Жалядскімі. Ксяндзова зямля. Ксендз Булька (1943-1944г).

**50.Козі хрыбет –** поле паміж Спондамі і Ж.Жалядскімі.

**51.Букслы.**

**52.Сцімбрышкі** - поле каля Спондаў, непадалёк ад Ж-Жалядскіх. Да сённяшняга дня памятаецца такі выпадак, які здарыўся на гадавое свята Шасціннік (Шоснік). Брыгадзірка мясцовага калгаса Ванда Кулда паслала трактарыстаў ў поле працаваць, хоць яны і не хацелі, спасылаючыся на свята. У той жа дзень здарылася навальніца і маланка забіла брыгадзірку (1973 год).

**53.Капаная гара.**

**54Хлебніца -** поле.

**55.Камяніца -** шмат камення на полі.

**56.Язвіны** – поле.

**57.Жарства** - хмызнякі.

**58.Гуры** - горы, расце мацярдушка ( душыца).

**59.Выгары** - гара, зараз кар'ер. Расце арніка горная.

**60.Загор'е** - горы.

Мікратапонімы Спондаўскага краю

**61.Вялікая дарога -** ад Масцян да Полацкага тракта.
**62.Папова гара.**
**63.Свецкага поле** – Свецкі – настаўнік за польскім часам.
**64.Лядскае поле.**
**65.Камяніца.**
**66. Могілкі** - гара каля самай вескі. За польскім часам стаяў маяк. Захаванні французаў.
**67.Маліннікі** – зараслі.
**68.Лужкі** - сенакос каля рэчкі.
**69.Прыстань -** сенакос каля рэчкі.
**70.Клетка** - сенакос у Стаўпянятах.
**71.Кінеўя -** сенакос.
**72.Падклённе** – поле.
**73.Заполле.**
**74.Прэсі.**
**75.Гаі -** поле.
**76.Заднішкі.**
**77.Лісіныя норы.**
**78.Козі хрыбет.**
**79.Прызба.**
**80.Лейбава гара.**
**81.Яцкава гара.**
**82.Карэя.**
**83.Вуглі.**
**84.Маяк.**
**85.Каванішкі** - поле каля Страчанкі.
**86.Паўмонне.**
**87.Пякета** – гара.
**88.Мілашова гара.**
**89.Сярэдняя змена** – поле.
**90.Аселіца.**
**91.Вялікая Лука.**
**92.Рачкава Лука.**
**93.Пячышча** – сенакос.
**94.Гуры -** гарыстая мясцовасць.
**95.Колева гара -** самая высокая гара каля Страчанкі.
**96.Коляў камень** - камень ля падножжа гары.
**97.Жарык** - хмызнячок.

Мікратапонімы Спондаўскага краю

**98.Яцынава поле** - належала пану Яцыне, вылучаецца роўным рэльефам і пладароднасцю, чыстае, без хмызнякоў.

**99.Харашоева** - поле каля Страчы, некалі жыў амерыканец па прозвішчу Харашэй.

**100.Шаўцова гара** – некалі жыў шавец.

**101.Таўце –** памежак.

**102.Паўтарачка** – луг (сенакос).

**103.Падвяззе** – луг (сенакос).

**104.Бровар** – поле.

**105.Круглішка** – поле каля Страчы.

**106.Ямы.**

**107.Доўгая гара –** каля пасёлка.

**108.Жвіроўня.**

**109.Яжгурова** – поле.

**110.Марысьчына поле.**

**111.Дубішча.**

**112.Падумісава поле.**

**113.Калода –** пасьбішча каля гасцінца, каля р.Страча.

**114.Станевічаў гай** - поле, сенакос.

**115.Багданішкі.**

**116.Маразы** – ніва.

**117.Камарышкі** - былы хутар.

**118.Сіманішкі** - поле.

**119.Папова лаза** – ніва.

**120.Дубы** - месца адпачынку над рэчкай Страча. Тут адзначаліся калгасныя святы праца і песні, фестывалі.

**121.Барайшаўская гара** - каля хутара Барэйшыха.

**122.Жвіроўня** - кар'ер каля Вераб'ёў.

**123.Цаліна.**

**124.Рамашова гара**.

**125.Жыдоўскі гарод** - дзірван. Калісьці былі пахаваны жыды. Потым з гэтага месца бралі жвір, то пасля на гэтай дарозе здаралася многа аварый.

**126.Свяццё** – гара высокая. З яе ўсё бачна. Думаю, што назва ад таго і паходзіць, што з яе бачны ўвесь свет.

**127.Лысая гара** – неўрадлівая зямля каля х.Кавалёўшчына. Нават дзікая трава расці не хоча.

**128.Рамашова гара** – вялікія залежы гліны, якую бралі для цагельні

**129.Крокенікі** – гара, паросшая лесам.
**130.Качарга вялікая** – поле каля х.Барэйшыха.
**131.Качарга малая** – меншы кавалак поля, там жа.
**132.Цігіна** – поле.
**133.Анатрыня** – поле за Сенюцямі.
**134.Лукі** - сенакос за Сенюцямі.
**135.Галубіная гара** - расце арніка горная.
**136.Жмойдзініха** - поле каля Гінкішак.
**137.Сырыцава** – поле каля лесу Шорцава.
**138.Каймінка** – гара каля Каймінскага возера. Зараз месца правядзення купалаўскіх вакацый.
**139.Тубісіха** – поле.
**140.Бондзішча** - поле, былы хутар.
**141.Гарэла-вострава** – поле.
**142.Палачніва** - (палач – ніва ) – доўгае поле.
**143.Сахара** - гара пясок.
**144.Пунішча** - поле.
**145.Клінішча** - поле.
**146.Сялібы.**
**147.Куты бліжнія.**
**148.Куты дальнія.**
**149.Пескаватка.**
**150.Кукорчык.**
**151.Капцы.**
**152.Шахаўніца.**
**153.Выспа** - гара.
**154.Кімсы** - луг.
**155.Церабеж.**
**156.Лукі.**
**157.Гокцішкі.**
**158.Пясчаны гасцінец** - вядома, што па ім праходзіў Напалеон праз Зязюльчын гаек.
**159.Бурвалок.**
**160.Перакоп** – гара.
**161.Аселіца.**
**162.Кінеўя.**
**163.Трацякі** – поле каля Ёдабора. Разгадка назвы магчыма крыецца ў тым, што яно займае роўна 3 гектары.
**164.Вашкішкі** - поле паміж Косцевічамі і Гінкішкамі.

**165.Калміха бліжняя** – поле паміж балот.
**166.Калміха дальняя.**
**167.Рыбакова бліжняя** – нівы. Грэбля.
**168.Рыбакова дальняя.**
**169.Востраў** - дзірванок, акружаны балотамі.
**170.Пасекі.**
**171.Садок** - прыгожы невялікі дзірванок сярод балот.
**172.Астальныя.**
**173.Круглая** - поле.
**174.Буслы** - поле. Сенажаць.
**175.Гарады.**
**176.Янчышкі** - нівы.
**177.Шляі** - ворнае поле.
**178.Доугія шляі.**
**179.Баравыя.**
**180.Лука** - поле каля Акартэляў.
**181.Варатэчкі** – поле каля лесу.
**182.Пад Сівіцай** - поле каля лесу.
**183.Астравец** - поле, кругляк, пам1ж балот.
**184.Янкава гара** - пад Гудалямі.
**185.Глінішча** - поле.
**186.Вербнік** - поле.
**187.Саўкава гара.**
**188.Старына** - зараслі ад Пілімаў да Масцян. Расце ВАРАНЕЦ - лекавая расліна. Выкарыстоўваецца ў народнай медыцыне ад спалоху.
**189.Пад бабуляй-** дзірван.
**190.Пад сасонкай.**
**191.Вялікі камень** - лонка, на якой спрадвеку ляжыць камень-валун, самы вялікі ў акрузе.
**192.Баравая.**
**193.Кругляк.**
**194.Варацечкі** - мяжа паміж Кісялеўскім і Пілімскім палямі.
**195.Граніца.**
**196.Пад маяком** – поле.
**197.Чырвоная гара** – у 1931 годзе польскімі вайскоўцамі з Пабрадзе быў адноўлены маяк, невысокі, на 3 столікі. Яго называлі візіркай (вышка).

## Мікратапонімы Спондаўскага краю

**198.Грыгоркава гара**-расце сухацвет пясчаны, каштоўная лекавая расліна.
**199.Сучая гара** у Масцянах.
**200.Габыль** - сенакос.
**201.Доўгая сенажаць.**
**202.Шусціцкая.**
**203.Пад соснай.**
**204.Святы камень** - поле і камень з адбіткам чалавечага следу каля Вялікай вёскі.
**205.Сядзіба** - горка ля Вялікай вёскі.
**206.Лысая гара** – пагорак.
**207.Маргі** **-** ніўкі.
**208.Папялішча-** поле.
**209.Кнігаўка.**
**210.Краснікі** - лонка (палянка).
**211.Пад Мяркушом.**
**212.Высокая гура.**
**213.Масленіха** – луг.
**214.Каладніца.**
**215.Канцы.**
**216.Плітніца** - гара.
**217.Жвіркі** - поле.
**218.Курапасека** - поле.
**219.Палігон.**
**220.Пугачыха** - поле каля Папялішча.
**221.Могільнік** - перад Вялікай вескай. Выкопвалі косці.
**222.Кацярынка** - поле і гара каля Клюшчан.
**223.Падлуг** - вялікая сенажаць каля Шайкун.
**224.Бацян.**
**225.Рыбняк.**
**226.Вісюра** - высокая гара у Кісялях.
**227.Пагавісак** - прыгорак побач з Вісюрай.
**228.Круглая ніўка.**
**229.Падзасценак** - ніва.
**230.Ярашоў бярэзнік.**
**231.Моньчына поле.**
**232.Моньчын бырэзнік.**
**233.Масленічыха** - поле.
**234.Лугі** - сенакос.

**235.Лучкі сенакос.**

**236.Паўмонне** - поле.

**237.Алешнікі** - сенажаць.

**238.Аселіца.**

**239.Аляксандрава Вапнярка** - прыгорак. Пры Польшчы Аляксандр Кісель трымаў вапнярку, прадукцыю якой выкарыстоўвалі для пабелкі печаў, падмуркаў і замест цэменту.

**240.Адам камень.**

**241.Чортаў камень** - па дарозе на Пілімы, служыў арыенцірам для войск Напалеона.

**242.Вінцукоў бярэзнік.**

**243.Паўлініна гара** - растуць скочкі – дэкаратыўная рэдкая расліна.

**244.Крыжакі** - ніва.

**245.Круглая** - сенакос.

**246.Казлова гара.**

**247.Плаха** - сенакос.

**248.Стральцова гара** - гара каля Сухарышак, некалі гэта зямля надежала паляўнічаму з вескі Трашчаны, якога празывалі Стральцом

**249.Паддубнік** - поле каля Будрань.

**250.Другая гара** - каля Будрань.

**251.Шпіклерная гара** - ранней была з вострым шпілем наверху.

**252.Лысая гара.**

**253.Курганкі** - неудабіца.

**254.Папярэчка** - поле.

**255.Слупок** - гара.

**256.Пад слупком.**

**257.Капліца** - гара паміж Будранямі і Пятрашышкамі.

**258.Пад Корбутам** - поле.

**259.Стоцяя гара.**

**260.Папаратніца** – ніўка.

**261.Футар** - поле.

# Мікратапонімы Спондаўскага краю

## Назвы лясоў і пералескаў

**1.Сасоннік** – невялікі лес каля Глушыцы.

**2.Круглы сасонік** – невялікая круглая горка, растуць падасінавікі

**3.Кузенька** – невялікі кавалак лесу каля хутара . У 50-х гадах там стаяла кузня. Кавалём быў Мечыслаў Валуевіч. Акрамя таго расказвалі, што там пахаваны французкія салдаты. З суседніх хутароў прывозілі ў Кузеньку закопваць бульбу на захаванне, дык, капаючы яму выкопвалі збрую, гузікі і нават зламаную шаблю.

**4.Бярэзнік.**

**5.Алешнік.**

**6.Юшыца** – цёмны гушчар, растуць чорныя грузды.

**7.Нівы** – грыбны лес.

**8.Жаўцякі.**

**9.Баравога аселіца.**

**10.Вялікае балота.**

**11.Шульгачова ніўка.**

**12.Дзікавіны.**

**13.Ёдаўка** – ельнік. Назва паходзіць магчыма ад літ. ёдас – чорны.

**14.Верацея доўгая** – лісічнае месца ў Трашчанскім лесе.

**15.Высокая.**

**16.Падазерца.**

**17.Вокны.**

**18.Белы бор** – баравічнае месца.

**19.Бор 1-ы.**

**20.Бор 2-гі** – захавалася многа ям, дзе Трашчанскія людзі закопвалі на зіму бульбу. Зараз у гэтых месцах добра растуць лісічкі.

**21.Касцянішкі** – туды вывозілі паўшую жывёлу, шмат касцей.

**22.Нізенькі барок.**

**23.Зруб.**

**24.Брост** – кусты на першым бары.

**25.Стаў** – лес каля рэчкі.

**26.Пральня** – масток праз рэчку і брод у лесе. Па паданнях недалёка размяшчаўся панскі маёнтак. У Пральні

служанкі мылі панскае адзенне. Тут жа быў калісьці і млын.

27.**Курыліха** – лясное балота.
28.**Радушыха** – вялікі лес.
29.**Жоўтая гара** – каля Радушыхі.
30.**Крапіўніца** – збуравейка ў Радушысе.
31.**Тарбатрос** – высокі круглы дзірван, а ў цэнтры – яма.
32.**Воўчыя ямы** – за Петрашыснымі сенажацямі.
33.**Барсучына** – ельнік.
34.**Мяцюклы** – лясное балота, растуць журавіны.
35.**Козі хрыбет.**
36.**Яловая** - мае выгляд літары Г. Вайной там хавалі гаспадары коней.
37.**Скяршына** – крыжавыя дарогі (былі) на Пагулянку, на Барані і на хутары.
38.**Асіновая** – векавыя асіны, такавішча глушцоў.
39.**Грымячы ручэй.**
40.**Глыбокі роў.**
41.**Загарэлішкі.**
42.**Зялёненькая.**
43.**Адрынішча.**
44.**Дрывасек.**
45.**Цыганскі табар** – вельмі прыгожая горка.
46.**За руч'ём.**
47.**Клемансаў імшарок** - каля Клюшчан.
48.**Глей** – каля Сухарышак.
49.**Імшар І** – каля Гудалёў.
50.**Імшар ІІ.**
51.**Смалярня** – лес каля Шайкунь. На самай справе працавала смалярня пры пану Сволькену.
52.**Дуброўка.**
53.**Красная.**
54.**Караснік.**
55.**Коравы пасекі.**
56.**Караснік.**
57.**Звярынец.**
58.**Маскоўка.**
59.**Судзілка.**
60.**Асінавы масток.**

61.**Марэйня** – лясная сенажаць.
62.**Самсонаў лес** – на пачатку мінулага веку у пана Сволькена служыў лесніком Самсон, меў зямлю на вырубках.
63.**Маяк** – на горцы ў лесе стаяў самы высокі маяк.
64.**Мошка** – лес за капліцай.
65.**Баброўня.**
66.**Доўгая гара.**
67.**Каменны масток** – лес каля Будрань.
68.**Церабеж.**
69.**Лісія норы** – каля Будрань.
70.**Каладніца** – лес каля Масцян.
71.**Падгай –** лес каля Лакцян. Жыў ляснік Чыжэўскі.
72.**Масцянскі лужок –** грыбны лес.
73.**Бушэўскі лес** – належаў лынтупскаму пану Юзэфу Бішэўскаму, які праслыў вялікім аматарам і знаўцам лесу. Ведаў і бярог кожнае дрэва, але, тым не менш, калі здаралася што ў каго-небудзь пажар знішчаў будынкі, то на будоўлю новага дома пан выдзяляў будаўнічае дрэва бясплатна. А дрэва з Бушэўскага лесу было моцным і цанілася высока. Яшчэ з дзяцінства памятаю як разважалі мужчыны: “Ого! Гэта хата пабудавана з Бушэўскага лесу, яна два вякі прастаіць!”. І цана на гэтыя дамы была заўсёды большай.
74.**Амшарына** – хмызнякі ад Ж.-Жалядскіх да Стаўпянят.
75.**Рудаўка** – лес каля Страчанкі.
76.**Даржэнькі.**
77.**Будышаўскі лес.**
78.**Крыськамшар** – лес расце як бы дугой.
79.**Гляе –** глеявая глеба.
80.**Сяліцкі лес.**
81.**Падліпа.**
82.**Пад Станкевічам** – лес каля Страчы. Жыў ляснік Станкевіч, запомнілі людзі як знаўцу і аматару лесу. Пры ім высаджвалі новыя пасадкі. Для дзікіх кабаноў садзілі малавядомы тады тапінамбур (дзікую бульбу).
83.**Бор** – лес паміж Сенюцямі і Валодзькамі (вёскі).
84.**Шкапленіца.**
85.**Паянісіха –** лес ад Вераб’ёў да гасцінца.

Мікратапонімы Спондаўскага краю

**86.Ёдзеўскія канцы.**

**87.Ёдаўка** – лес ад Горшавіч да Страчы.

**88.Ашронка** – лес каля Страчы.

**89.Лаўкі** – лес.

**90.Камарышкі** – лес.

**91.Гляе.**

**92.Падзыбайле – лясок** на горцы, дзе растуць рэдкія сосны.

**93.Дубішча.**

**94.Дубы** – урочышча, на левым беразе р.Страча. Сярод людзей тых месц і па сённяшні дзень захавалася легенда пра магутнага чараўніка, які лячыў людзей і памагаў ім. А яму за гэта з навакольных вёсак людзі прыносілі дары – хто што мог. І гэта было няпісаным законам. Аднойчы ганарлівы і скупаваты жаніх не даў падарунка чараўніку і не запрасіў на вяселле. Калі госці, па звычаю, вадзілі вакол дуба карагод, кіраўнік зрабіў так, што ўся вясельная працэсія ператварылася ў каменне, адубела. Бог пакараў помслівага чараўніка – пярун спаліў яго хату і пашчапаў дуб, які стаяў побач, а каменне засталося ляжаць. З-за камянёў месца гэта і сталі называць Адубы, а пасля – ***Дубы***.

Пляцоўка там даволі роўная. Над самай рэчкай вакол растуць магутныя дубы. Ды і знаходзіцца яно побач з гасцінцам. Таму і была абрана раённым кіраўніцтвам як месца адпачынку. З 60-х гадоў мінулага стагоддзя там штогод сталі праводзіць фестывалі песні і працы дзвух калгасаў – “Савецкая Беларусь” і імя 50-годдзя ВЛКСМ.Калі першы раз рыхтавалі пляцоўку для свята, каменні ссунулі і вывезлі на ферму в. Лушчыкі. А яны аказаліся зачараванымі і прынеслі няшчасце людзям: пакалечыўся трактарыст, які іх звозіў; каровы гэтай фермы загінулі ад яшчура; пасля згарэла і сама ферма.

**95.Пагарэлле** – лес.

**96.Зязюлька.**

**97.Масцішч**а – лес і сенажаць каля Кайміны.

**98.Януткаў дзірван** – лес.

**99.Ельнік** – лес.

## <u>Мікратапонімы Спондаўскага краю</u>

**100.Баравы** – лес каля <u>Акартэляў.</u>
**101.Табароўка –** лес, невялікі астравок каля рэчкі Трасцяніца.
**102. Кут.**
**103.Сівіца** – лес.
**104.Цёмныя** – лес каля <u>Гінкішак.</u>
**105.Піцюліха** – гара ў лесе.
**106.Ламы** – лес.
**107.Дзічына** – лес, кабані пераход.
**108.Чубок** – лес на прыгорку, акружаны пяскамі, Сахарай.
**109.Высмалы** - паміж Бондзішчам і Косцевічамі. Сонцам высмалены пясок.
**110.Шорцава** – паміж Акартэлямі і Каймінай.
**111.Доўгі мост** – ад Горшавіч да Гінкішак.
**112.Хмяліннік**
**113.Косцевічамі -** Многа маслякоў.
**114.Махі** – лес і балота.
**115.Жукавянскі лужок**
**116.Грымячы** – лес за <u>Галубінай</u>. Воўчае месца.
**117.Курылка** – лес.
**118.Зімнік** – ляс над возерам.
**119.Летнік** – лес над возерам.
**120.Кукор** – ад Кукра на Летнік на пач. 19 ст. быў пабудаваны праз возера падвясны мост. Везлі ў Жалядскі касцёл на канях звон, ланцугі, на якіх быў падвешаны мост не вытрымалі грузу і лопнулі і звон утапіўся разам з коньмі. Некаторыя чулі як з-пад зямлі на тым месцы даносіўся прыглушаны звон.
**121.Пасьбішчы.**
**122.Руч'і** – лес і поле. Два равы злучаюцца і ўпадаюць у возера.
**123.Норкішкі** – другая гара ў лесе . Многа лісіных і янотавых нор.
**124.Бярэзнік.**
**125.Перавес** – гара і лес над возерам, сунічнае месца. Зараз стаяць дачныя вагончыкі.
**126.Белы пясок.**
**127.Дзігімы** – воўчы пераход.
**128.Прыслон** – лес над возерам за <u>Горшавічамі.</u> Многа змеяў. Расказвала Я.Б.Канчанін як адзін паляўнічы ў верасні, калі гады хаваюцца ў зямлю, бачыў у яме цэлы клубок

змей. Узяў доўгую хварасціну і пачаў іх пароць. “Як выскачыў з ямы іхні кароль і пагнаўся за ім, то бег гэты паляўнічы не азіраючыся, убег у дом і дзверы на засувень замкнуў.

**129.Барсучына** – ельнік. Паляўнічыя жартаўліва называюць яго звярынай сталіцай, таму што невядома якім чынам, але там ўжываюцца некалькі відаў звяроў: барсукі, яноты, дзікі, ваўкі, лісы.

**130.Перакоп** – гара ў лесе,вясковы могільнік (хаваюцца людзі з Горшавіч).

## Дадатак

**Жураўліннік** (фота І.Валуевіч)





**Трасцяніца**
(фота Ф.Станевіча)

<u>Мікратапонімы Спондаўскага краю</u>

**Жвірыдаўка**

(фота І.Валуевіч)



**Баравога аселіца**(фота І.Валуевіч)



**Шайкуні (капліца)** (фота І.Валуевіч)



**Петрашышскія горы** (фота Ф.Станевіча**)**



**Радушыха** (фота І.Валуевіч)



**Жоўтая гара** (фота І.Валуевіч)



Мікратапонімы Спондаўскага краю

**Стральцова гара** (фота І.Валуевіч)



**Аўтар вельмі ўдзячны людзям, якія дапамаглі сабраць патрэбныя звесткі. У першую чаргу гэта маці,**

**Элеаноры Іванаўне Валуевіч**

**а таксама сяброўцы Зофіі Бярнардаўне Шапель, Яніне Браніславаўне Канчанін з Гінкішак, Зузанне Антонаўне Міхновіч з в. Сухарышкі, Томашу Іосіфавічу Юхно з Трашчан, Валянціне Уладзіміраўне Ражко са Страчы, Івану Адольфавічу Салаўю са Спондаў, а таксама**

**Казіміры Уладыславаўне Валуевіч**
**з в.Пілімы**

**На першай старонцы вокладкі фота Ф.Станевіча**
**"Трысцяніца"**